WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

22 КАСТРЫЧНІКА 2011 г. СУБОТА
№ 202 (27066)
Кошт 800 рублёў
ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

## УРАД БЕЛАРУСІ Ў 2012 ГОДЗЕ ПЛАНУЕ ВЫЙСЦІ НА БЕЗДЭФІЦЫТНЫ БЮДЖЭТ

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 21 кастрычніка прыняў з дакладам прэм'ер-міністра Міхаіла МЯСНІКОВІЧА і старшыню праўлення Нацыянальнага банка Беларусі Надзею ЕРМАКОВУ.**

Кіраўнік дзяржавы папрасіў у першую чаргу далажыць яму пра сітуацыю на валютным рынку. «Галоўнае пытанне вядомае. З майго пункту гледжання, сітуацыя на валютным рынку развіваецца так, як і прагназавалі, наколькі я інфармаваны», — адзначыў ён. «Хацелася б пачуць, які ўплыў гэта акажа на спажывецкі рынак», — звярнуўся Аляксандр Лукашэнка да Міхаіла Мясніковіча. Таксама кіраўнік дзяржавы пацікавіўся вынікамі міжнародных форумаў, якія прайшлі нядаўна ў Санкт-Пецярбургу і ў якіх браў удзел прэм'ер-міністр Беларусі.

Надзея Ермакова далажыла Аляксандру Лукашэнку пра тое, што ў апошнія 5 месяцаў краіна ўстойліва выйшла на станоўчае сальда. Так, паводле аператыўнай інфармацыі, за верасень паступленні склалі $4 млрд 96 млн, а выплаты — $3 млрд 641 млн. Кіраўнік дзяржавы даручыў падтрымаць курс на такім узроўні, каб, па-першае, ён адпавядаў рэальнасці, і, па-другое, каб гэты курс садзейнічаў развіццю эканомікі. Паводле слоў Надзеі Ермаковай, у цэлым «сітуацыя на валютным рынку нармальная». Прапанова валюты перавышае попыт. «Хоць сёння (21 кастрычніка) па еўра Нацыянальны банк рабіў інтэрвенцыі...» — паведаміла кіраўнік Нацбанка. Таксама нармальная сітуацыя складаецца і на рынку наяўнай валюты. «Крыху насельніцтва хвалявалася, і таму па долары знізілася прапанова насельніцтва, але мы спадзяёмся, што сёння яна адновіцца», — сказала Надзея Ермакова. На яе думку, выхад на адзіную сесію быў зроблены своечасова. «Гэта перыяд, калі пачаўся новы падатковы тыдзень, і прадпрыемствы, каб плаціць падаткі, прынеслі выручку для продажу на біржу. Курс іх задавальняе», — адзначыла старшыня праўлення Нацбанка. Пры гэтым яна дадала, што ўдзельнікі валютнага рынку атрымалі ўпэўненасць у пытанні курсаўтварэння і доступу да валюты.

— У нас ёсць інструменты, яны адладжаны. За той перыяд, пачынаючы з 14 верасня, калі дзейнічала рынкавая дадатковая сесія, мы пераканаліся, што можна згладжваць вострыя вуглы курсу. Гэта нармальная сітуацыя, гэта сусветная практыка.

Кіраўнік Нацбанка таксама паведаміла, што адзначаецца прырост укладаў у беларускіх рублях. «Магчыма, правільна, што ў беларускіх рублях прырост ідзе больш высокімі тэмпамі, таму што, як бы там ні было, стаўкі па ўкладах у беларускіх рублях высокія», — сказала Надзея Ермакова.

У сваю чаргу, прэм'ер-міністр Міхаіл Мясніковіч праінфармаваў кіраўніка дзяржавы пра тое, як працуе эканоміка ва ўмовах новага курсаўтварэння, у тым ліку пра разлікі ўрада па грашовых даходах насельніцтва. Прэзідэнтам дадзены даручэнні, каб рэальныя даходы — гэта значыць, даходы, скарэктаваныя на ўзровень інфляцыі, — забяспечвалі жыццёвы ўзровень не ніжэй, чым ён быў дасягнуты ў 2010 годзе. Акрамя таго, Міхаіл Мясніковіч далажыў Аляксандру Лукашэнку пра разлікі ўрада ў сферы будаўніцтва жылля і сельскагаспадарчых аб'ектаў. Кіраўніку дзяржавы было даложана пра асноўныя падыходы па прагнозе сацыяльна-эканамічнага развіцця і фарміраванні бюджэту 2012 года.

Кіраўнік дзяржавы падтрымаў падыходы ўрада па зніжэнні стаўкі падатку на прыбытак з 24 да 18%, па падтрымцы інавацыйных і імпартазамяшчальных вытворчасцяў, а таксама іншыя прапановы. «Гэта будуць базісныя ўмовы 2012 года пры забеспячэнні стабільнасці валюты, невысокага ўзроўню інфляцыі і своечасовага абслугоўвання знешняга доўгу. Мы таксама плануем выходзіць на бездэфіцытны бюджэт 2012 года. Такім чынам, 2012 год — гэта будзе год у пэўнай ступені і эканамічнага росту, але галоўнае — збалансаванага развіцця», — падкрэсліў Міхаіл Мясніковіч.

Кіраўнік дзяржавы паставіў задачу забяспечыць безумоўную рэалізацыю ўсіх намечаных планаў па стабільным функцыянаванні валютнага і спажывецкага рынкаў.

**Паводле паведамленняў прэс-службы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і БЕЛТА.**

## АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА РАЗГЛЕДЗЕЎ КАДРАВЫЯ ПЫТАННІ

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь 21 кастрычніка разгледзеў кадравыя пытанні. Аб гэтым карэспандэнту БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.**

Кіраўнік дзяржавы назначыў **БАРСУКОВА Аляксандра Пятровіча** начальнікам галоўнага ўпраўлення ўнутраных спраў Мінскага гарвыканкама.

**Прэзідэнт таксама даў згоду на назначэнне:**

**ПІСАНІКА Леаніда Фёдаравіча** старшынёй Ельскага райвыканкама;

**ЦІТКА Аляксандра Іванавіча** старшынёй Хойніцкага райвыканкама;

**СЫСОЕВА Васіля Васільевіча** старшынёй Крычаўскага райвыканкама;

**ПІСАРЫКА Сяргея Паўлавіча** — старшынёй праўлення ААТ «Ашчадны банк «Беларусбанк».

## ТРУБНЫЯ СОТЫ

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.



Ганцавіцкі завод «Модуль» — вытворца сучасных прэс-ізаляваных труб.

Акно ДАІ!

## «ЗА ТУМАНАМ НІЧОГА НЕ БАЧНА!»

**Гэта ўжо не словы з песні, а папярэджанне для вадзіцеляў ад супрацоўнікаў Дзяржаўтаінспекцыі.**

Паводле прагнозаў сіноптыкаў, адзначаюць у ДАІ, на гэтыя выхадныя, асабліва раніцай, чакаюцца моцныя туманы, дымка, а тэмпература паветра ноччу будзе вагацца ад мінус сямі да нуля. Таму вадзіцелям, якія плануюць начныя і ранішнія паездкі, неабходна загадзя і ў абавязковым парадку паклапаціцца аб змене летніх шын на зімовыя, што значна палепшыць кіраванне аўтамабілем ва ўмовах слізкай дарогі і дапаможа скараціць тармазны шлях.

Ва ўмовах абмежаванай бачнасці, а ў тумане і ў час дажджу асабліва, кіруючыся папярэджаннямі і абмежаваннямі, устаноўленымі знакамі, раяць вартавыя дарог, выбірайце бяспечную хуткасць руху з улікам стану праезнай часткі і бачнасці ў накірунку руху. Пазбягайце рэзкага тармажэння, асабліва на закругленні шашы ці «гравійкі», павялічце дыстанцыю і бакавы інтэрвал руху, адмоўцеся ад здзяйснення неабгрунтаваных абгонаў, будзьце максімальна ўважлівымі пры праездзе перакрыжаванняў і пешаходных пераходаў.

## ДОЛАР І РАСІЙСКІ РУБЕЛЬ ТРОШКІ ПАТАННЕЛІ

Пасля другога дня таргоў на адзінай сесіі Беларускай валютна-фондавай біржы долар патаннеў на 20 рублёў, расійскі рубель — на 1, а еўра застаўся на ранейшым узроўні.

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.**

**КУРСЫ НА 21 КАСТРЫЧНІКА:**

Долар ЗША — 8660 беларускіх рублёў;
Еўра — 11900 беларускіх рублёў;
Расійскі рубель — 276 беларускіх рублёў.

**КУРСЫ НЕКАТОРЫХ БАНКАЎ НА 21 КАСТРЫЧНІКА:**

**«Беларусбанк»:** долар ЗША — 8300 і 8700; еўра — 11400 і 12000; расійскі рубель — 262 і 277.

**«Дэльта Банк»:** долар ЗША — 8000 і 9000; еўра — 11200 і 12400; расійскі рубель — 255 і 280.

**«Банк Гандлёвы Капітал»:** долар ЗША — 8000 і 8600; еўра — 11000 і 11900; расійскі рубель — 250 і 275.

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

## «У БЕЛАРУСІ АХОВА ЗДАРОЎЯ ВЫВЕДЗЕНА НА СУСВЕТНЫ ЎЗРОВЕНЬ»

**Ніякія прыватныя структуры не вырашаць замест дзяржавы праблему аховы здароўя. Аб гэтым на сустрэчы з удзельнікамі II Еўразійскага кангрэса кардыёлагаў заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка.**

«У свой час мне давялося прымаць «страшнае» рашэнне (я не думаў, што мы яго ажыццявім) па развіцці аховы здароўя ў нашай краіне». Паводле яго слоў, ахова здароўя — гэта, перш за ўсё, дзяржаўны прыярытэт. «Правільна гаворыць акадэмік Яўген Чазаў (генеральны дырэктар Расійскага кардыялагічнага навукова-практычнага комплексу, акадэмік Расійскай акадэміі навук і Расійскай акадэміі медыцынскіх навук. — Заўвага БЕЛТА), што ніякія прыватныя кампаніі, ніякія прыватныя структуры і медыцынскія цэнтры і ўрачы-прыватнікі не вырашаць праблему аховы здароўя, калі гэтым не будзе займацца дзяржава. Больш таго, першая асоба дзяржавы», — лічыць Прэзідэнт.

### Новая праграма падтрымкі шматдзетных сем'яў распрацоўваецца ў Беларусі

«Цяпер выпрацоўваем новую праграму падтрымкі, асабліва шматдзетных сем'яў», — паведаміў кіраўнік дзяржавы. «Нам нікуды не дзецца, акрамя як будаваць і перадаваць ва ўласнасць дамы і прысядзібныя ўчасткі ў самых прэстыжных мясцінах каля Мінска, у вёсках тым, хто нарадзіў пяцёра дзяцей. Вось табе домік (не палац, нармальны домік, каб можна было жыць) і прысядзібны ўчастак, сотак 20-30. Такіх сем'яў у нас ужо дастаткова», — расказаў Аляксандр Лукашэнка.

«Я падумаў аб тым, што такім сем'ям давядзецца дзяржаве будаваць. Няхай, скажам, 20 гадоў яны не плацяць, а потым 50 працэнтаў у валютным эквіваленце, калі ўжо дзеці вырастуць, будуць цвёрда стаяць у жыцці, няхай палавіну вернуць на працягу якога-небудзь тэрміну. Над сістэмай можна падумаць, але гэта было б добра. Гэта падштурхне нараджальнасць», — упэўнены беларускі лідар.

СТАР. 2

**ХОЗЯЙСТВЕННЫЙ СУД ГОРОДА МИНСКА**

**ОБЪЯВЛЯЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПУБЛИЧНЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА, ПРИНАДЛЕЖАЩЕГО КПУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ИННОВАЦИОННЫЙ ЦЕНТР»**

**Лот № 1.** Установка паротурбинная «Двина» Р-0,25-14/6, расположенная по адресу: Минская обл., г.п. Уречье, ул. Заводская, 1, стоимостью 321 920 460 (Триста двадцать один миллион девятьсот двадцать тысяч четыреста шестьдесят) рублей РБ. Установка является стационарной, предназначенной для привода механизмов различного назначения в счет использования энергии избыточного давления водяного пара. Бывшая в эксплуатации. Внутренняя мощность — 250 кВт, частота вращения ротора 3000 об/мин. Параметры пара перед стопорным клапаном: вид пара — насыщенный, температура — 191 град.С., давление — 1,4 МПа. Давление пара за турбиной — 0,6 МПа. Номинальный расход пара на турбину — 12,0 т/ч. Масса установки — 2500 кг. Изготовитель — СООО «НТЦ ЭНОТЕХ», Республика Беларусь. Находится в очень хорошем техническом состоянии.

Стоимость имущества указана с учетом НДС.

Минимальная величина первого шага составляет 5% от стоимости реализуемого с торгов имущества.

**Подробная информация об имуществе размещена на сайте: http://minsk. court.by/, а также в помещении хозяйственного суда г. Минска: г. Минск, ул. Академическая, 15/1. Торги состоятся 10 ноября 2011 года в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Академическая, 15/1, каб. 201. За дополнительной информацией обращаться: судебный исполнитель Сидорок И.В., тел./факс: 294 93 29 (86), 8 029 177 32 61 ст. судебный исполнитель Вярьвильский Д.А., тел 294 93 67.**

Задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (лота) должен быть перечислен на депозитный счет № 3642900000072 в ОАО «АСБ Беларусбанк» Минск, код 795, УНП 101541763 хозяйственного суда города Минска не позднее чем за 24 часа до начала проведения торгов.

В соответствии с пунктом 1 Указа Президента Республики Беларусь от 05.05.2009 г. № 232 «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги.

Приорбанк RZB Group

**БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 01 октября 2011 г.**

«Приорбанк» Открытое акционерное общество
г. Минск, ул. В. Хоружей, 31-а

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт пояснительной записки | на 1 октября 2011 | на 1 октября 2010 |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | | 653 322,1 | 266 124,6 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | | 3 887,5 | 876,8 |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | | 548 966,2 | 156 988,7 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | | 1 223 320,0 | 510 977,7 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | | 0,0 | 51 170,4 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | | 6 451 320,2 | 3 754 471,9 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | | 805 312,8 | 46 627,3 |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | | 21 164,4 | 9 736,4 |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | | 326 250,1 | 248 184,6 |
| 11 | Имущество, предназначенное для продажи | 1110 | | 568,8 | 157,2 |
| 12 | Прочие активы | 1111 | | 98 219,6 | 61 415,1 |
| 13 | **ИТОГО активы** | **11** | | **10 132 331,7** | **5 106 730,7** |
| 14 | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | | |
| 15 | Средства Национального банка | 1201 | | 6 051,6 | 2 663,5 |
| 16 | Средства банков | 1202 | | 2 747 202,4 | 989 092,5 |
| 17 | Средства клиентов | 1203 | | 5 912 839,8 | 3 062 700,3 |
| 18 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1204 | | 183 684,9 | 133 569,8 |
| 19 | Производные финансовые обязательства | 1205 | | 5 290,5 | 4 583,8 |
| 20 | Прочие обязательства | 1206 | | 104 102,1 | 38 359,1 |
| 21 | **ВСЕГО обязательства** | **120** | | **8 959 171,3** | **4 230 969,0** |
| 22 | **КАПИТАЛ** | | | | |
| 23 | Уставный фонд | 1211 | | 412 279,3 | 412 279,3 |
| 24 | Эмиссионный доход | 1212 | | 0,0 | 0,0 |
| 25 | Резервный фонд | 1213 | | 151 149,1 | 107 616,0 |
| 26 | Фонд переоценки статей баланса | 1214 | | 116 780,5 | 92 285,3 |
| 27 | Накопленная прибыль | 1215 | | 492 951,5 | 263 581,1 |
| 28 | Всего капитал | 121 | | 1 173 160,4 | 875 761,7 |
| 29 | **ИТОГО обязательства и капитал** | **12** | | **10 132 331,7** | **5 106 730,7** |

**ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ на 01 октября 2011 г.**

«Приорбанк» Открытое акционерное общество
г. Минск, ул. В. Хоружей, 31-а

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт пояснительной записки | на 1 октября 2011 | на 1 октября 2010 |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | | 586 233,0 | 446 827,7 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | | 310 090,9 | 202 778,1 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | | 276 142,1 | 244 049,6 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | | 444 602,6 | 209 534,9 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | | 74 791,5 | 29 795,8 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | | 369 811,1 | 179 739,1 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | | 1 738,1 | 55,9 |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | | 181,5 | (426,8) |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | | (598 254,5) | 78 589,8 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | | 806 020,5 | (28 734,4) |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | | 237 693,8 | 68 636,2 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | | 64 515,0 | 35 107,4 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | | 227 440,9 | 168 104,9 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | | 47 787,7 | 34 204,1 |
| 15 | Прибыль до налогообложения | 211 | | 407 231,4 | 237 435,4 |
| 16 | Налог на прибыль | 212 | | 88 384,5 | 58 003,1 |
| 17 | **ПРИБЫЛЬ** | **2** | | **318 846,9** | **179 432,3** |

Председатель Правления — Костюченко С.А.

Зам. главного бухгалтера — Капцевич С.И.

Лицензия на осуществление банковской деятельности НБ РБ № 12 от 28.08.2008 года. УНП 100220190.

Анатоль ТОЗІК:

Парламенцкі дзённік

## «Пенсіі плануецца павялічыць на 20% з 1 лістапада»

### КРОПКАВАЕ РАШЭННЕ ГЛАБАЛЬНЫХ ПРАБЛЕМ

*Цяперашняя сацыяльная стратэгія беларускага ўрада — аказваць падтрымку максімальна адрасна*

У Авальнай зале ўчора, як ніколі падчас адказаў урада, панавала аднадушнасць паміж прадстаўнікамі заканадаўчай і выканаўчай улады. «Я з вамі цалкам згодны» — стала літаральна рэфрэнам выступлення **віцэ-прэм'ера Анатоля ТОЗІКА** ў адказ на просьбы, прапановы і пажаданні дэпутатаў. Тыя, у сваю чаргу, падтрымлівалі ініцыятывы, агучаныя намеснікам прэм'ер-міністра. Напрыклад, **пажыццёва пазбаўляць правоў тых, хто быў затрыманы п'яным за рулём. А таксама канфіскаваць аўто ў такіх кіроўцаў, прычым незалежна ад таго, з'яўляецца парушальнік уласнікам ці не.** «Мы ўнясём адпаведны законапраект у парламент. Я хацеў бы, каб дэпутаты нас падтрымалі», — сказаў спадар Тозік. Парламентарыі пачалі аказваць падтрымку адразу ж на пасяджэнні. «Статыстыка, насамрэч, катастрафічная», — пагаджаецца **дэпутат Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па нацыянальнай бяспецы Алег КОТ.** «Гінуць маладыя працаздольныя людзі, і часцей за ўсё не тыя, хто кіраваў транспартным сродкам у стане алкагольнага ап'янення».

Узаемаразуменне яны знайшлі і ў абмеркаванні праблем адукацыі. Зноў жа дэпутат Кот выказаўся за неабходнасць перагляду парадку залічэння ў ВНУ. Ён лічыць, што абітурыенты ВНУ, якія набралі падчас іспытаў надзвычай нізкі прахадны бал, павінны навучацца ў прафесійна-тэхнічных установах (якія хутка прызвычаіліся называць ліцэямі, але ПТВ усё ж неяк больш зразумела). У сваю чаргу, віцэ-прэм'ер прыгадаў выпадкі, калі людзі набіралі абсалютны мінімум і таксама паступалі. **Налета, паводле яго слоў, плануецца істотна перагледзець правілы прыёму ў навучальныя ўстановы.** Так, напрыклад, **ёсць ідэя ўстанавіць ліміт балаў, «ніжэй за які няма чаго рабіць у ВНУ», акцэнтуе віцэ-прэм'ер.** «Адзіным крытэрыем пры паступленні ў ВНУ павінны быць мазгі». **Таму прапануецца таксама цалкам скасаваць любыя льготы.** А таленавітым і здольным, якія маюць патрэбу ў падтрымцы і па нейкіх прычынах не здолелі рэалізаваць сябе, «дапамагаць пасля з'яўлення загаду [аб залічэнні]». **Адзначае ён і неабходнасць скарачэння набору ў ВНУ.** Краіне неабходныя рабочыя-інтэлігенты, як выказаўся намеснік прэм'ер-міністра, маючы на ўвазе кваліфікаваную рабочую сілу. Таму патокі для паступлення ў вышэйшыя, сярэднія спецыяльныя і прафесійна-тэхнічныя ўстановы плануюць у пэўнай ступені пераразмеркаваць.

**А пакуль тым, хто вучыцца ў ВНУ, верагодна, дазволяць плаціць не за семестр адразу, а ўносіць грошы штомесяц.** З такой прапановай выступіў **дэпутат Аляксандр ЛАСЯКІН.** «Гэта рэальна. Мы такія рэкамендацыі-ўказанні дадзім», — паабяцаў віцэ-прэм'ер. «На гэтым этапе трэба з разуменнем паставіцца да тых, хто там навучаецца».

«Гэты этап» віцэ-прэм'ер наўмысна не называе крызісным.

— Я перакананы, што крызісу ў краіне няма. Ёсць праблемы, якія мы павінны вырашыць за год, — заявіў ён у Авальнай зале.

А журналістам пасля патлумачыў, што «крызіс — гэта калі не працуюць прадпрыемствы, не выплачваюцца заробкі, калі мы не можам фінансаваць сістэмы сацыяльных устаноў». А ў нас, кажа намеснік кіраўніка ўрада, «усё працуе». Прычым такое перакананне з'явілася ў спадара Тозіка, паводле яго ўласных слоў, не таму што ён віцэ-прэм'ер, а як у чалавека, «які крыху ведае нешта пра жыццё і здолеў нешта пабачыць у гэтым свеце».

Выступаючы ў Авальнай зале, А.Тозік падкрэсліў:

— Мы не бачым ніякіх падстаў для перагляду тых мэт і задач, якія павінны вырашыць да 2015 года. Неабходны патэнцыял у краіны ёсць. Рэальнай і выканальнай застаецца галоўная мэта — увайсці ў лік 50 краін з найвышэйшым індэксам развіцця чалавечага патэнцыялу, а таксама 30 краін з найлепшымі ўмовамі для вядзення бізнэсу, дасягнуць узроўню і якасці жыцця чалавека, сувымерных з сярэднееўрапейскімі.

Віцэ-прэм'ер удакладняе, што дасягнуць гэтай мэты немагчыма без стварэння ў краіне прынцыпова новых вытворчасцяў, прадпрыемстваў і галін, якія выпускалі б экспартаарыентаваную, высокатэхналагічную, высоканкурэнтную прадукцыю. «Мы павінны ў максімальна кароткія тэрміны стварыць новае аблічча беларускай эканомікі». Таму найважнейшыя задачы, якія стаяць перад урадам, — вывад эканомікі краіны з праблемнага перыяду і забеспячэнне ўмоў для збалансаванага і дынамічнага развіцця ў постпраблемны перыяд.

**Старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па бюджэце, фінансах і падатковай палітыцы Аляксандр АНТОНЕНКА** непакоіцца, што выхад на адзіны курс пацягне за сабой рэзкі рост цэн на імпартныя лекі. Яны, нагадаем, раней закупляліся на льготных умовах — па курсе Нацбанка.

— Рэзкага росту не будзе, — заяўляе Анатоль Тозік.

Запасаў лекаў, закупленых на льготных умовах, хопіць, паводле яго звестак, яшчэ на паўтара — два месяцы. Але надалей рост цэн непазбежны, «іначай застанемся наогул без лекаў», даходліва тлумачыць сітуацыю намеснік кіраўніка ўрада. Прычым падаражэюць не толькі імпартныя, але і айчынныя прэпараты, бо пры іх вытворчасці на «60—65 адсоткаў выкарыстоўваюцца імпартныя складнікі». За гэты час ва ўрадзе плануюць зрабіць адэкватныя захады па павышэнні пенсій, дапамог, заробкаў.

**Віцэ-прэм'ер падкрэсліў, што цяперашняя сацыяльная стратэгія, у прынцыпе, арыентуецца на максімальна канкрэтную, кропкавую, адрасную падтрымку.** Прычым грошы на гэтыя мэты пойдуць з прыбытковай часткі бюджэту, запэўнівае А.Тозік, а запускаць эмісію — задзейнічаць «друкавальны станок» — не давядзецца.

**— Мы плануем значна падняць пенсіі з 1 лістапада — адсоткаў на 20, — інфармуе віцэ-прэм'ер.**

Але ў перспектыве пенсійную праблему плануюць вырашаць глабальна.

**— Нам трэба падумаць пра павышэнне пенсійнага ўзросту,** — паведаміў Анатоль Тозік журналістам, удакладніўшы, што гэта яго асабістае меркаванне. — Але падумаць так, каб чалавек быў сам зацікаўлены пазней выходзіць на пенсію, бо гэтая пенсія будзе значна вышэйшай.

Паводле яго слоў, урад зараз уважліва даследуе замежны вопыт — напрыклад, шлях, пройдзены Украінай. «Будзем выпрацоўваць і прапаноўваць кіраўніку дзяржавы такі фармат, які будзе прымальным для грамадства, лепшым для кожнага пенсіянера і пад'ёмным для краіны». Вызначацца трэба, на думку віцэ-прэм'ера, у найбліжэйшы час.

— У нас ужо 2,5 млн пенсіянераў на 4,5 млн працуючых, і гэтыя суадносіны, на жаль, будуць пагаршацца, — мяркуе А.Тозік.

А калі казаць пра рашэнне дэмаграфічнай праблемы, то гэта, натуральна, павелічэнне нараджальнасці. «На тэрыторыі нашай краіны могуць камфортна пражываць 30—40 млн чалавек, — перакананы намеснік прэм'ера. — Нам усімі сіламі трэба ствараць культ здаровай, прыгожай, ідэальнай сям'і з трыма дзецьмі». Але да гэтага яшчэ, так бы мовіць, нараджаць і нараджаць: толькі ў 5 адсотках беларускіх сем'яў выхоўваюць траіх дзетак.

**Ала МАЧАЛАВА.**

## «ЗАЛАТЫ» ДЫПЛОМ

*Кошт навучання ў чарговы раз павышаецца — на 25 працэнтаў*

**НЕ паспелі студэнты беларускіх ВНУ прызвычаіцца да новых «цэннікаў» на платнае навучанне, а першакурснікі ўключыцца як след у студэнцкае жыццё, як іх зноў паставілі перад фактам — кошт навучання ў чарговы раз павышаецца, што звязана з павышэннем з 1 кастрычніка тарыфнай стаўкі першага разраду і павелічэннем выдаткаў на камунальныя плацяжы. Такім чынам, кошт навучання сёлета пераглядаецца ўжо ў трэці раз: першы раз павышэнне адбылося ў разгар зімовай сесіі, а другі раз — напярэдадні новага навучальнага года. Прычым і першае, і другое павышэнне былі вельмі адчувальнымі для сем'яў студэнтаў.**



Як вядома, згодна з заканадаўствам, ВНУ і сярэднім спецыяльным навучальным установам дадзена права самастойна павялічваць аплату па ўсіх формах навучання з улікам эканамічна абгрунтаваных выдаткаў.

— Пасля аналізу ўсіх прапаноў навучальных устаноў па павелічэнні кошту навучання было выпрацавана кансалідаванае рашэнне: кошт навучання не можа быць павышаны больш чым на 25 працэнтаў ад сённяшняга кошту, — паведамілі журналісту «Звязды» ў галоўным адукацыйным ведамстве.

Навучальныя ўстановы могуць правесці пераразлік у сувязі з тым, што з 1 кастрычніка ў Беларусі стаўка першага разраду была павялічана на 28 працэнтаў. Згодна з гэтым павелічэннем, установы адукацыі пры неабходнасці могуць перагледзець калькуляцыю на платнае навучанне па артыкулах «заработная плата» і «налічэнні на заработную плату», а таксама па артыкуле «накладныя выдаткі» ў частцы аплаты камунальных плацяжоў. Пры гэтым у планавую калькуляцыю выдаткі ўключаюцца па нормах і нарматывах для бюджэтных арганізацый.

Перагляд цэн на платнае навучанне вышэйшыя і сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы будуць праводзіць у адзін этап. **Рашэнне, з якога чысла рабіць пераразлік (з 1 кастрычніка ці 1 лістапада), установы адукацыі будуць прымаць самастойна.**

Міністэрства адукацыі рэкамендавала ўсім кіраўнікам навучальных устаноў, з улікам сацыяльнай значнасці паслугі, на падставе заяў грамадзян **ажыццяўляць спагнанне дадатковай платы за навучанне з адтэрміноўкай для навучэнцаў плацяжоў, а таксама прадастаўляць плацяжы па спагнанні дадатковай платы за навучанне ў растэрміноўку.**

Трэба дадаць, што насамрэч выдаткі на падрыхтоўку спецыяліста могуць перавышаць устаноўлены кошт. Узровень цаны ў канкрэтнай ВНУ залежыць ад спецыяльнасці, якую атрымлівае студэнт, кваліфікацыі, стажу работы прафесарска-выкладчыцкага саставу і іншых педработнікаў, стану матэрыяльна-тэхнічнай базы. Традыцыйна самай дарагой (прычым не толькі ў нас, але і ва ўсім свеце) з'яўляецца вышэйшая медыцынская адукацыя. Праўда, на звышпрэстыжных спецыяльнасцях у Беларускім дзяржаўным універсітэце кошт навучання амаль дагнаў кошт падрыхтоўкі спецыялістаў у медыцынскіх ВНУ і вагаецца на розных спецыяльнасцях сёння ад 5,3 да 7,5 мільёна рублёў. Пагадзіцеся, што плюс 25 працэнтаў ад 7 мільёнаў — гэта неслабы ўдар па кішэні...

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

ISSN 1990 - 763X

**Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 22.10.2011 г. (для б/н разліку)**

| | | | |
|---|---|---|---|
| 1 долар ЗША | 8 660,00 | 1 чэшская крона | 474,75 |
| 1 еўра | 11 900,00 | 1 польскі злоты | 2 701,94 |
| 1 латвійскі лат | 16 859,73 | 1 расійскі рубель | 276,00 |
| 1 літоўскі літ | 3 443,61 | 1 украінская грыўня | 1 082,50 |

**Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ**

| | |
|---|---|
| USD | 31,3361 |
| 10 UAH | 39,1579 |
| 10000 BYR | 36,1015 |
| EUR | 43,1373 |



# Калі ў доме «ГАСПАДАР» — то ў доме дастатак

**Адно з найбольш буйных прадпрыемстваў краіны па вытворчасці мукі, крупы, мучных сумесяў, камбікармоў для ўсіх відаў сельскагаспадарчых жывёл і птушкі, а таксама мяса свініны, малака і збожжа — акцыянернае таварыства «Баранавічхлебапрадукт». Сёлета яго калектыў адзначыў сваё 65-годдзе.**

**Спецыфікай гэтага прадуктовага холдынга з'яўляецца закончаны цыкл вытворчасці: пачынаючы ад вырошчвання збожжа, яго ўборкі і захоўвання на элеватарах, наступнай перапрацоўкі на муку і камбікармы, выкарыстання іх на ўласным жывёлагадоўчым комплексе і малочнатаварных фермах з наступнай перапрацоўкай гатовага мяса, да рэалізацыі ва ўласную гандлёвую сетку.**

**Прадукцыя з брэндам «Гаспадар» шырока вядома спажыўцам як на тэрыторыі рэспублікі, так і за яе межамі.**

Аб стане спраў у акцыянерным таварыстве наша газета інфармуе свайго чытача досыць рэгулярна. Пра сённяшні дзень перадавога прадпрыемства расказваюць **генеральны дырэктар ААТ «Баранавічхлебапрадукт», член Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу РБ Наталія МАНЬКО** і яе калегі.

**— Як вам працуецца ў новых умовах, Наталія Віктараўна? Мы не пытаемся «Як вы выжываеце?», бо ведаем патэнцыяльныя магчымасці калектыву, і пра гэта размова не ідзе. Але як вам «гаспадарыцца»? Ці ўдаецца ўтрымаць пазіцыі і нават прырастаць?**

— У любой сітуацыі важна працаваць з халоднай галавой. І калі раніцой толькі прачынаешся, ведаць, што ты будзеш рабіць цэлы дзень. Каб аддзяліць другараднае ад галоўнага. І каб гэты кожны дзень стаў хоць у нечым, хоць бы маленькім, але крокам наперад.

**— Мы не былі на вашым прадпрыемстве роўна год. Што за год змянілася, і ў лепшы бок?**

— Мы захавалі вытворчы калектыў, у людзей ёсць работа — а гэта самае галоўнае. Вытрымліваем дастаткова высокія вытворчыя тэмпы. Нарошчваем асартымент і якасныя параметры прадукцыі, што дазваляе частку яе адпраўляць на экспарт. Робім крокі да імпартазамяшчэння — пачалі мантаж лініі па вытворчасці старцерных і перадстарцерных камбікармоў для маладняку жывёлы першых месяцаў і нават дзён жыцця. Нашы магутнасці па выпуску камбікармоў працуюць на мяжы магчымага, і пуск новай лініі дасць адчувальны штуршок для іх далейшага развіцця. Тым больш, што сучасныя еўрапейскія тэхналогіі з прымяненнем мікрадазіравання інгрэдыентаў, гранулявання гатовага прадукту запатрабуюць больш скрупулёзнага падыходу да рэцэптуры.

Калі раней, яшчэ да ўсіх тых крызісных з'яў у сусветнай эканоміцы, якія потым сваім крылом зачапілі і нас, я іншым разам сумнявалася ў правільнасці некаторых рашэнняў, якія мы прымалі, то зараз не сумняваюся. Напрыклад, што ўжо ў апошні час зрабілі абсалютна правільна, калі асмеліліся на рэканструкцыю і нарошчванне пагалоўя на свінакомплексе «Усходні» і ўклалі ў гэта немалыя сродкі — каля 36 мільярдаў рублёў.

Інвестуем у асноўным за кошт уласных крыніц, не залазячы па выніках года ў вялікія даўгі. Прадпрыемства працуе рэнтабельна, што і дазваляе рабіць значныя адлічэнні ў фонд накаплення — адсюль і інвестыцыі. Плюс сродкі на амартызацыю і невялікая, тым не менш — падтрымка фонду энергазберажэння. Адным словам, тое, што задумалі, рэалізуем у межах уласных магчымасцяў. Гэта вельмі важна, калі крэдыт у выніку супадае з дэбітам.

Але патрэбны наступныя крокі. Сёння яшчэ раз пераканалася, што прыйшоў час для пераносу ўчастка мясаперапрацоўкі ў іншае месца і для пачатку рэалізацыі гэтага перспектыўнага праекта ў цэлым. Я маю на ўвазе пашырэнне перапрацоўкі мяса. Пытанне гэтае ў стадыі вырашэння.



Начальнік мукамольнай вытворчасці Віктар БАРЫСЕВІЧ.

Мы ўдасканалілі прыём прадукцыі. Але ў нас ёсць праграма па далейшым скарачэнні ручной працы. Я разумею таксама, што на галаўным прадпрыемстве мы не абыдземся без уласнай кацельні. Яна патрэбна нам і па новай тэхналогіі — каб грануляваць камбікармы з дапамогай пары.

А калі гаварыць пра комплекс «Усходні», то тую рэканструкцыю, якую мы пачалі, будзем працягваць. Як па адкорме, як па матачніку, так і па цеплазабеспячэнні. Гэтыя праграмы абавязаны выканаць.

Што датычыць нашага сельскагаспадарчага ўчастка, то там пачалі рэканструкцыю буйной фермы. У нейкай меры абапіраліся на льготныя дзяржаўныя крэдыты. Сёння на грошы дзяржавы разлічваць не можам, але дзякуй, што дапамаглі зрабіць пачатак.

Прытрымліваюся жыццёвага прынцыпу — завяршаць пачатую работу. Таму ведаю, якім будзе наступны год. Будзем «шліфаваць», удасканальваць вытворчыя працэсы, дацягваць да патрэбнага ўзроўню ўсе свае структурныя падраздзяленні, у дзейнасці асобных з іх у нейкай ступені прысутнічае лёгкі налёт утрыманства. Калі існуе агульны разліковы рахунак, то лёгка хавацца за чужую спіну. Магчыма, нам варта падумаць пра ўвядзенне гаспадарча-разліковых адносін. І прывучыць усіх без выключэння кіраўнікоў прымаць рашэнні, браць адказнасць на сябе, а не чакаць, пакуль гэта зробіць генеральны дырэктар. Хаця грашыць не хачу, у цэлым каманда ў нас дружная, зладжаная, эфектыўная. Нават не каманда, а аркестр, у якім усе чуюць адно аднаго і разумеюць «дырыжора».

Так што работы многа, асабліва ў сельскагаспадарчым сектары. Мы ўкладаем у яго шмат сродкаў, у нейкай ступені не дадаём асноўнай вытворчасці, і хочам мець ад СВУ крыху іншую аддачу — значна большыя ўраджаі, надоі, прывагі. Мы б хацелі, каб нашы аграрыі адчувалі сябе паўнавартаснымі членамі агульнага калектыву акцыянернага таварыства, цанілі пастаянную і рознабаковую падтрымку з яго боку і смялей бралі на сябе адказнасць за вынікі агульнай работы.



У кладаўшчыцы Алесі КАЗЛОЎСКАЙ настрой цудоўны.

**— Вы — шматпрофільнае прадпрыемства, і гэтая шматпрофільнасць вам дапамагае?**

— Шматпрофільнасць дае кіраўніку і калектыву магчымасць для гаспадарчага манеўра, асабліва ў складаных рынкавых умовах. З дапамогай адной галіны, аднаго ці некалькіх паспяховых падраздзяленняў можна падтрымаць астатнія. Што мы, да слова сказаць, і робім у адносінах да свайго аграрнага сектара. Калі хочаце, яна дае маштабнасць мыслення, нават радавому работніку, не кажучы ўжо пра кіраўнікоў любога рангу.

Праўда, тут важна адчуваць нейкую разумную меру, каб шматпрофільнасць не стала самамэтай і не ператварылася ў кару Гасподнюю. І каб не было дапушчана нейкіх перакосаў. Скажам, мы сёння не змаглі б пайсці далей у павелічэнні свайго аграрнага складніка. Гэта правільна сказана: «Не кладзі яйкі ў адзін кошык». Але справядліва і наступнае: «Не пакладзі ў кошык разам з яйкамі і камень».



Начальнік змены Ірына ШАРКЕЛЬ.

Ва ўсіх сваіх пачынаннях мы не супраць абаперціся на моцнае плячо інвестара. Хто б ні выступіў у яго ролі — дзяржава, беларускія банкі ці знешні інвестар. Прыцягваючы інвестара, у тым ліку замежнага, мы маем на ўвазе перш за ўсё не ўласныя, а дзяржаўныя інтарэсы. Хаця б таму, што трымальнікам кантрольнага пакета акцый выступае дзяржава. Гэта патрэбна разумець і больш давяраць прадстаўнікам айчыннага дырэктарскага корпуса ў пошуку крыніц фінансавання і партнёраў, зацікаўленых у выніках сумеснай працы.

Але любы калектыў жыве не толькі вытворчасцю. Так і мы: клапоцімся пра сваіх ветэранаў, вырашаем сацыяльныя праблемы. Размова ідзе аб стварэнні цэласнай сістэмы сацыяльнай абароны членаў працоўнага калектыву. А таксама аб фарміраванні карпаратыўнай культуры ва ўсіх падраздзяленнях, больш эфектыўнай дзейнасці сістэмы стымулявання і матывацыі высокіх паказчыкаў у працы. Ад сябе я яшчэ б дабавіла: і ў адпачынку. Калектыў, які не ўмее адпачываць, не будзе паўдарнаму працаваць. Наш калектыў адпачывае даволі разнастайна і цікава. Сёлета сціпла, але адзначылі 65-годдзе з дня заснавання прадпрыемства. Прычым даволі арыгінальна — 50-кіламетровым велапрабегам па памятных мясцінах свайго раёна.

**У мяне ёсць такое адчуванне, што мы мала кажам «дзякуй» адно аднаму — у жыцці, на рабоце. Карыстаюся выпадкам, каб праз парламенцкую і ўрадавую газету «Звязда» сказаць свайму калектыву «дзякуй» за працу і пажадаць поспехаў. Кожнаму вытворчаму падраздзяленню і кожнаму амаль з 1700 працаўнікоў.**



Гэты стары млын сустракае кожнага, хто ўваходзіць на тэрыторыю галоўнага прадпрыемства. Такі незвычайны помнік тут пабудавалі, каб уславіць старажытную прафесію млынара.

## «УСЯ ПРАДУКЦЫЯ — САЦЫЯЛЬНА ЗНАЧНАЯ»

Яшчэ адзін наш субяседнік — **намеснік генеральнага дырэктара па эканоміцы Ірына КАРКОЦКАЯ.**

**— Калі можна, Ірына Васільеўна, давайце паглядзім, як па выніках паўгоддзя альбо нават дзевяці месяцаў для вас складвалася вытворчая сітуацыя, з якой эфектыўнасцю калектыў працаваў.**

— Адназначна на ваша пытанне адказваць складана, таму што тыя вядомыя працэсы ў эканоміцы, якія мелі месца, так ці інакш уплывалі на работу акцыянернага таварыства. Перш за ўсё чыста псіхалагічна, бо хацелася большай упэўненасці ў эканамічнай сітуацыі. Але калі гаварыць аб самой вытворчасці, то мы працуем сёлета ўвогуле паспяхова.

Тэмп росту выпуску таварнай прадукцыі ў нас застаўся высокім — больш за 150 працэнтаў у сённяшніх цэнах. Даволі высокі тэмп вытворчасці мукі — каля 160 працэнтаў прыросту ў натуральным выражэнні. Гэта значыць, павысіўся попыт на нашу асноўную прадукцыю — і экспартны, і ўнутраны. Перасталі завозіць расійскую муку — вырас унутраны попыт. Спрыяе гэтаму і больш актыўная работа аддзела маркетынгу па прасоўванні брэнда, а таксама адкрыццё склада ў Заслаўі, пад Мінскам, што дазволіла больш актыўна працаваць на сталіцу.

Каб зарабіць крайне неабходную валюту краіне, мы больш чым у тры разы павялічылі экспарт прадукцыі. Асноўныя экспартныя пазіцыі — мука жытняя (аржаная) шатраваная (абдзірная) і мяса свініны. Былі пастаўкі пшанічнай мукі ў Расію — першага і другога гатункаў, і ў Малдавію. Адпраўлялі прадукцыю таксама ў Азербайджан, Латвію і Літву. Водгукі самыя лепшыя, на якасць нашага натуральнага, з душой зробленага прадукту не скардзіўся ніхто. Не дзіўна, бо за якасцю кантроль самы пільны і вельмі прынцыповы.

Так што працуем дастаткова эфектыўна. Павялічылася рэнтабельнасць вытворчасці — больш чым у тры разы ў параўнанні з адпаведным леташнім перыядам. (Летась вы былі ў нас у гэты самы час і бачылі, што планка паказчыкаў і тады была ўзнята даволі высока.) Зараз выйшлі на ўзровень рэнтабельнасці продажу вышэй за 10 працэнтаў, а для нашай галіны гэта вельмі добра.

Ёсць рост аб'ёмаў і па вытворчасці камбікармоў. У сувязі з палітыкай дзяржавы па нарошчванні колькасці жывёлагадоўчых комплексаў, будаўніцтве новых малочнатаварных фермаў, скіраванай у выніку на павелічэнне выпуску мяса і малака, расце попыт на камбікармы. Што характэрна — расце попыт на камбікармы высокай якасці. Калі раней мы выраблялі іх для кароў па традыцыйным, будзем так гаварыць, рэцэпце, то зараз многія гаспадаркі (у тым ліку і наш буйны сельскагаспадарчы вытворчы ўчастак, які быў створаны шляхам зліцця двух калгасаў) ужо патрабуюць камбікармы менавіта для высокапрадуктыўных кароў. Альбо мэтава — для маладняку. Гэта значыць, яны ўжо больш граматна падыходзяць да рацыёну кармлення статка. Так што ў выніку ў нас пашырыўся і асартымент камбікармоў.

Сёлета мы пачалі больш выпускаць вітамінных бялкова-мінеральных дабавак, іх гаспадаркі могуць самастойна ўносіць у кармы. Канкрэтна — у зерне, і балансаваць кармы па спажывецкіх якасцях.

Насельніцтва таксама павялічыла попыт на камбікармы. Таму пастаўляем іх у гандлёвую сетку ў затараным выглядзе, каб спажыўцам было зручна.

Ёсць пэўныя поспехі на комплексе па вытворчасці свініны «Усходні». Дзякуючы пастаяннай увазе з боку кіраўніцтва акцыянернага таварыства, падтрымцы кармамі і ўкладзеным вялікім сродкам справы там выраўняліся, калектыў працуе стабільна.

Нашы земляробы вырасцілі сёлета больш зерня збожжавых культур і рапсу, ураджайнасць больш высокая, чым раней. Хоць гэта пакуль чацверты вынік у раёне, але калі ўлічыць не вельмі высокі бал зямлі, то не так і дрэнна. Ва ўсякім разе, прагрэс ёсць.

Калі гаварыць аб перспектывах, то менавіта сёння мы прыступаем да работ па мантажы новай тэхналагічнай лініі на камбікормавай вытворчасці. Гэта лінія па выпуску камбікармоў для «дзетак», як мы кажам — нованароджаных цялят, парасят, птушанятак першых дзён жыцця, рыб каштоўных відаў, у тым ліку асятровых. Гэта імпартазамяшчальны і цалкам акупляемы праект, бо ў рэспубліцы такія кармы не выпускаюцца, і для маладога папаўнення гаспадаркі стараюцца закупляць іх за мяжой. Патрэбен спецыяльны, «тонкі» рэцэпт, і там вельмі многа складнікаў. Так што ў нас будзе неабмежаваны рынак збыту, нават у сваёй краіне, канкурэнтаў тут у нас няма і ніша свабодная. Спадзяюся, да канца года выпусцім на новай лініі першыя тоны дэфіцытнага камбікорму.

**— Пад якія праекты вы хацелі б прыцягнуць інвестараў, у тым ліку замежных?**

— У нас ёсць два цікавыя праекты на недалёкую будучыню. Першы — біягазавая ўстаноўка на комплексе «Усходні», магутнасць якой дазволіць нават прадаваць рэшткі энергіі электрасеткам. Праект гэта не танны, і мы шукаем прамога замежнага інвестара.

І яшчэ адзін буйны і надзвычай перспектыўны праект — па будаўніцтве новага цэха, ці нават завода, па перапрацоўцы мяса свініны з уласным цэхам забою. Баранавіцкі рэгіён застаўся без мясакамбіната, і ў выніку ў нас значныя транспартныя затраты на дастаўку свіней на Бярозаўскі мясакамбінат, бо магчымасці ўласнага цэха вельмі абмежаваныя.




**— Вы сказалі аб новым падыходзе да камбікармоў з боку спажыўцоў. А ці ўдаецца прывучыць іх да збалансаванага кармлення статка?**

— Малако — гэта рэнтабельная пазіцыя для сельгасвытворцаў. І розніца ў цане за малако «Экстра» і іншых гатункаў адчувальная. Так што само жыццё прымушае гаспадаркі ўсур'ёз займацца збалансаваным кармленнем жывёлы, паўнацэннымі рацыёнамі і прыслухоўвацца да нашых рэкамендацый. У нас у аддзеле маркетынгу адразу два спецыялісты — заатэхнік і тэхнолаг — займаюцца распрацоўкай штомесячных рацыёнаў кармлення розных груп жывёлы і рэцэптурай камбікармоў — у залежнасці ад штомесячнага ўдою. Чым вышэйшы ўдой, тым большыя патрабаванні да камбікорму. Ёсць спецыяльныя камп'ютарныя праграмы, ёсць напрацоўкі, мы ахвотна імі дзелімся са сваімі партнёрамі. Наш спецыяліст рэгулярна наведвае гаспадаркі і вядзе адпаведную работу з заатэхнікамі.




Намеснік генеральнага дырэктара ААТ «Баранавічхлебапрадукт» па эканоміцы і маркетынгу Ірына КАРКОЦКАЯ.

**— Вы гаварылі аб росце экспартнага паказчыка. А камбікармы таксама ідуць на экспарт?**

— Камбікармы ў сувязі з павышаным попытам унутры рэспублікі цалкам застаюцца ў краіне. Наша задача — у першую чаргу накарміць айчынны статак. Лічым сябе прамежкавым звяном — наш камбікорм дазваляе адпраўляць на экспарт больш мяса і малака і такім чынам зарабіць для краіны больш валюты.

**— Якія яшчэ рэзервы вы бачыце на будучае?**

— Рэзервы — у далейшай механізацыі, нават аўтаматызацыі прыёмкі сыравіны і працэсаў адгрузкі гатовай прадукцыі. Ёсць патрэба ў будаўніцтве новых ёмістасцяў для захоўвання збожжа. Але, у прынцыпе, размову патрэбна весці не аб працяглым яго захоўванні, а пра захоўванне пад рэальныя патрэбы перапрацоўкі. Так сёння працуюць з сыравінай у Еўропе.

Адчувальны рэзерв бачым у пашырэнні асартыменту мукамольнай (зараз гэта восем гатункаў) і крупяной прадукцыі, разлічанай на шырокага спажыўца, наогул сваёй прадукцыі. У «Скарбонцы здароўя» дадаткова наладзілі выпуск цэлай лінейкі фруктовых напаўняльнікаў: шматкі з вішняй, з малінай... Хто любіць іх з малаком, хто з кефірам, але водгукі толькі станоўчыя. Астатняя прадукцыя са «Скарбонкі» таксама разыходзіцца добра. Хлебазаводы і раней выпускалі хлябы з вотруб'ем, а зараз пачалі выпускаць з прымяненнем шматкоў пшанічных зародкаў, таму пастаўляем не толькі ў гандлёвую сетку, але і ім.

**— Ці можна сказаць, што «Гаспадар» сур'ёзна клапоціцца пра гаспадынь яшчэ і таму, што робіць упор на выпуск паўфабрыкатаў — мучных, мясных?..**

— Так і ёсць. Стараемся падтрымліваць тую лінейку мучных паўфабрыкатаў, якую выпусцілі і да якой многія беларускія гаспадыні прывыклі і шукаюць у крамах, калі ім патрэбна хутка згатаваць піцу ці аладкі, бліны альбо пончыкі, кексы. Крыху стрымлівае адсутнасць у дастатковай колькасці пакетаў для ўпакоўкі. Мясныя паўфабрыкаты таксама разыходзяцца цудоўна, але па-сапраўднаму разнастайны асартымент мы зможам выпускаць пасля пашырэння свайго мясаперапрацоўчага падраздзялення.

## СЫРАВІННАЯ ЗОНА І ЯЕ ПАДТРЫМКА

**Намеснік дырэктара прадпрыемства Аляксандр ВАРАНЕЦ:**

— Традыцыйна наша сыравінная зона па нарыхтоўцы збожжа — сем раёнаў, блізкіх да Баранавічаў. Сярод гаспадарак хацелася б адзначыць шэраг буйных вытворцаў, з якімі ў нас даўнія партнёрскія сувязі. У Баранавіцкім раёне гэта СВК «Крошын» (па вырошчванні харчовай пшаніцы), СВК «Паланечка», СВК «Берасні», у Ляхавіцкім — СВК «Жарабковічы», «Ляхавіцкі», СВК «Шлях новы», СВК «Ордэна Знак пашаны «Кастрычнік», у Івацэвіцкім «Святая воля», СВК «Новыя Стайкі», СВК «Целеханы-Агра», у Бярозаўскім — філіял «Луч» сыраробчага завода, СВК «Спорава», «Земляробзелец», СВК «Малеч», СВК «Нарутавічы», СВК «Бярозаўскае», у Драгічынскім — СВК «Асавецкі», «Заказельскі», СВК «Імянінскі» і шэраг іншых.

З іх дапамогай дзяржзаказ па пшаніцы ўдалося выканаць з некаторым перавышэннем. Па жыце на лічбы заказу цалкам выйсці не змаглі, але маем пераходны астатак мінулых гадоў, так што млын жытам будзе забяспечаны.



Новая малочнатаварная ферма Лотвічы неўзабаве будзе ўведзена ў строй.
Гэты адказны аб'ект нам паказвае брыгадзір будаўнікоў Дзмітрый ЛЯЎКОВІЧ.








За высокапрадукцыйным кутарам для вытворчасці фаршу — Марыя КУРЫЛІК.

Начальнік цэха перапрацоўкі мяса Ларыса МІХАН.

Рух транспарту на строгім уліку ў старшага кантралёра Паўла СЦЯЦКО.



Малады механізатар Аляксандр ЯРАШЭВІЧ выдатна асвоіў новы магутны трактар «Беларус-3022». У гэтыя дні Аляксандр працуе на ворыве.


Свінагадоўчы комплекс «Усходні» — адзін з буйнейшых у краіне.


Кацярына ЕМЯЛЬЯНЧЫК, Алена ПЯТРОЎСКАЯ, Сяргей БАРЫСЕВІЧ, Мікалай АСТАПУК працуюць у цэху перапрацоўкі мяса.



Галоўны тэхнолаг комплексу «Усходні» Часлава БАРЫСЕВІЧ.

Клапоцімся і пра нарыхтоўку фуражнага збожжа для вырабу камбікармоў. Сёлета адчуваецца дэфіцыт пшаніцы, ячменю і трыцікале. Спецыялісты камерцыйнага аддзела выязджаюць у гаспадаркі, вядзём работу з кіраўнікамі, каб заключыць дагаворы. Задача не з простых, бо ў нас тона збажыны каштуе 500 тысяч беларускіх рублёў, а ў суседняй Расіі 210 долараў ЗША. І гаспадары просяць цану, блізкую да расійскай. Але ўсё ж паразуменне ў большасці выпадкаў знаходзім. Складанасць у тым, што мы зараз у нейкай меры абмежаваныя ў крэдытных рэсурсах, не маглі своечасова выдзеліць сродкі на закупку. Разлічваем, што дапаможа кукуруза. Яе нарыхтоўку распачаў наш сельскагаспадарчы вытворчы ўчастак «Свіраны».

Падтрымлівалі гаспадаркі сваёй сыравіннай зоны авансаваннем у выглядзе пастаўкі камбікармоў на працягу ўсяго года. На гэтыя мэты былі выдзелены дастаткова сур'ёзныя сродкі, якія гаспадаркі выбралі камбікармамі.

## У АДКАЗЕ ЗА ПЯТНАЦЦАЦЬ ВЁСАК

**Павел ГАЛЯК, намеснік генеральнага дырэктара па ідэалогіі:**

— На тэрыторыі нашага СВУ размешчаны пятнаццаць населеных пунктаў. Тут можна коратка ўспомніць гісторыю іх з'яўлення ў складзе ААТ. У 2005 годзе да нашага прадпрыемства быў далучаны адзін з самых буйных у Беларусі комплекс па вырошчванні свіней «Усходні», а годам пазней далучылі дзве гаспадаркі — СВК «Лотвічы» Баранавіцкага раёна і «Верасвнёўскі». Яны былі аб'яднаны ў адзін буйны сельскагаспадарчы ўчастак, які ўваходзіць у структуру акцыянернага таварыства. Так што насельніцтва яго вёсак — наша, і пра яго таксама наш клопат. Як і пра калектыў комплексу. Мы — адно цэлае.

Калі летась праходзіў конкурс «Містар камбіната», то пераможцам стаў малады ветурач з СВУ Максім Сіцько. Ён прыехаў да нас па размеркаванні і прыжыўся, што называецца, у калектыве, што нас радуе. Да слова сказаць, крыху раней з поспехам прайшоў і конкурс «Міс камбіната», на якім перамагла начальнік змены мукамольнай вытворчасці Ірына Шаркель **(гл. здымак)**.

Але вернемся да «вясковай» тэмы. Вёскі — розныя, ёсць некалькі дастаткова буйных, яны пераўтвораны ў аграгарадкі. Але ў асноўным невялікія, размешчаны ў лясной зоне раёна. Спецыфіка такая, што шмат пенсіянераў, якія ў свой час працавалі ў сельскай гаспадарцы і пра якіх нам патрэбна паклапаціцца. Сваю работу мы не дзелім па геаграфічных прыкметах, а стараемся праводзіць комплексна.

Выязджаем на дні вёсак, якія праводзяцца ў раёне. Нядаўна кіраўнікі таварыства былі ў аграгарадку Перхавічы, дзе сустракаліся з людзьмі. У Доме культуры для мясцовых жыхароў быў арганізаваны канцэрт.

Дапамагаем вырашаць нейкія гаспадарчыя праблемы (тую ж веснавую пасадку бульбы) за вельмі сімвалічныя грошы. А для ўдзельнікаў вайны — наогул бясплатна. На тэрыторыі СВУ жывуць 13 ветэранаў вайны. Клапоцімся пра іх, аказваем матэрыяльную дапамогу. Камплектуюцца таксама святочныя падарункі з нашай прадукцыяй — мукой, крупамі і іншай.

Праблема замацавання кадраў на сяле існуе і ў нас, таму падтрымліваем кантакты з сярэднімі агульнаадукацыйнымі школамі ў Перхавічах і Лотвічах. Рашэннем райвыканкама яны замацаваны за намі, і мы не тое што дапамагаем, скажу інакш — жывём іх жыццём. Напрыклад, для Лотвіцкай школы заказалі сёлета пластыкавыя вокны і жалюзі. Іх калегам з Перхавічаў падарылі камп'ютар.

У нас ёсць свая падшэфная школа і ў горадзе. Днямі ёй споўнілася чвэрць стагоддзя. Мы актыўна дапамагалі яе калектыву, калі 21-ю школу толькі будавалі і затым адкрывалі — асабіста я добра памятаю тыя ўрачыстасці. І ўсе гэтыя дваццаць пяць гадоў падтрымліваем самыя цесныя сувязі. Зараз на свята таксама хадзілі не з пустымі рукамі. Так што маладую змену сабе рыхтуем са школьнай лаўкі.

## ПА СУЧАСНЫХ ТЭХНАЛОГІЯХ

**Выконваючы абавязкі начальніка комплексу па вытворчасці свініны «Усходні» Уладзімір АМБРАЖЭЙ:**

— Рэканструкцыя комплексу ажыццяўляецца шляхам уводу ў дзеянне недабудаваных раней карпусоў. Ідзе паэтапнае «засяленне» адкормачнікаў на 15 тысяч галоў. Калі зараз пагалоўе 70 тысяч свіней, то да сярэдзіны наступнага года хочам давесці яго да 85. А ў блізкай перспектыве пастараемся выйсці на праектную магутнасць — гэта больш за 100 тысяч галоў.

Адбылося ўжо некалькі «наваселляў» — у сёмым і восьмым будынках. А ў некалькіх сектарах будаўніцтва завяршаецца. Разам з тым, мы ўвялі шэсць сектараў свінарніка-матачніка, што напрамую паспрыяе племянной рабоце, яе эфектыўнасці. Ужо сёння па шэрагу паказчыкаў мы займаем другую-трэцюю пазіцыі пасля аднатыпных комплексаў вобласці — «Белавежскага» і «Заходняга», але імкнёмся на першыя ролі. З дапамогай галаўнога прадпрыемства нарошчваем аб'ёмы вытворчасці. Свінні ў асноўным мяснога накірунку, буйной белай пароды.

Падчас рэканструкцыі ўстанаўліваюцца новая сістэма вентыляцыі, сістэма выдалення гною і сістэма вільготнага, больш пажыўнага для жывёлы, кармлення. Пры вільготным кармленні прывагі намнога лепшыя, чым пры сухім, — больш за 700 грамаў у суткі. Да сухіх кармоў у дазатарах дабаўляюцца яшчэ і сыроватка, вітамінныя дабаўкі, якія засцерагаюць жывёлу ад хвароб. Пры кармленні мы поўнасцю адышлі ад ручной працы: закуплена і ўстаноўлена імпартная кармакухня, прыгатаванне і раздачу кармоў вядуць механізмы пад кантролем камп'ютара. Дарэчы, гэта навіна апошніх месяцаў: камп'ютарны кантроль увялі ў красавіку. Кармленне — чатырохразовае, па графіку.

Штат комплексу — 650 чалавек, у тым ліку 70 спецыялістаў, у асноўным з вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыяй. Гэта наш залаты фонд, наш патэнцыял, які мы выкарыстоўваем для таго, каб гаспадарыць эфектыўна, з улікам вопыту іншых айчынных і замежных буйных комплексаў і ў адпаведнасці з сучаснымі тэхналогіямі. Асабліва часта звязваемся і сустракаемся з калегамі з комплексу «Белавежскі» Камянецкага раёна. Нядаўна былі і на «Заходнім». Абменьваемся вопытам, гэта дае шмат карысці. На тым жа «Белавежскім» параўнальна нядаўна «падгледзелі», што на лініях паення жывёлы выкарыстоўваюцца не металічныя, ацынкаваныя, а больш даўгавечныя і больш танныя поліпрапіленавыя трубы. Зараз усё шырэй прымяняем іх у сябе.

Радуе, што да нас прыходзіць моладзь, за апошнія гады дабавілася ад 30 да 40 чалавек. У тым ліку ветурачы, механікі. Калектыў дружны, працавіты. Па ініцыятыве начальніка комплексу Георгія Хомчанкі (зараз ён на вучобе) штомесяц праводзім на ўчастках сходы калектываў, на якіх падводзім вынікі работы — па ўсіх накірунках. Лепшых працаўнікоў прэміруем, узнагароджваем сувенірамі — сімпатычнымі глінянымі парсючкамі. Чалавек прыносіць дадому такога сімпатычнага парсючка, і дамашнія ведаюць, што іх тата ці мама працуюць як мае быць. А для лайдакоў, ад якіх не застрахаваны любы буйны калектыў, у нас іншы «падарунак»: на прахадной вывешваецца лісток «Яны забіраюць грошы ад сям'і».

Стараемся, каб за вынікованасцю работы, у тым ліку за расходам камбікармоў, за культурай вытворчасці, тэхнікай бяспекі сачыў сам калектыў. Для гэтага і праводзяцца сходы, працуе бальная сістэма падвядзення вынікаў.

Калі гаварыць пра рамонтную службу, то ў першую чаргу я б назваў імёны такіх добрасумленных работнікаў, як начальнік рамонтна-механічнага ўчастка Віталь Кавальскі, інжынер-механік цэха ўзнаўлення Станіслаў Дзерман, які выканаў асноўны аб'ём мантажу новага абсталявання, а зараз паспяхова абслугоўвае яго; інжынер-механік па рамонце і абслугоўванні абсталявання Уладзімір Шэмет. Пералік можна працягваць.

Асаблівыя словы падзякі хачу сказаць прарабу Мікалаю Астапчыку. Гэта чалавек справы, ён праараб ад Бога. Пад яго энергічным кіраўніцтвам нашы будаўнікі (а іх 60 чалавек, цэлае ўпраўленне) праводзяць граматную рэканструкцыю будынкаў комплексу.


Прадукцыя комплексу «Усходні» ў крамах не залежваецца.


— Праз хвіліну гэтыя кантэйнеры з каўбаскамі «Гусарскія» трапяць у камеру тэрмаапрацоўкі, — тлумачыць рабочы цэха перапрацоўкі мяса Аляксей БАРЫСЕВІЧ.


Адзін з лепшых механізатараў — Аляксандр КАШКАРОЎ. Яму даручаны сучасны высокапрадукцыйны трактар «Джон Дзір».


Каўбаса «Апетытная» набывае свае спажывецкія якасці на ўчастку, дзе працуе аператар Аляксей БІЗГЕНЬ.


Здымак з фоталетапісу. Аматары спорту акцыянернага таварыства чарговы велапрабег прысвяцілі 65-годдзю свайго прадпрыемства. Маршрут прайшоў праз Баранавічы, Моўчадзь, Старыя Своораты, Пачапава, Застарынне, Кузевічы. На пярэднім плане — генеральны дырэктар ААТ «Баранавічхлебапрадукт» Наталія МАНЬКО (справа) і дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу РБ Святлана ПІШЧ.

## ЗАЯЎКІ ГАНДЛЮ ВЫКАНАЦЬ НЕ МОЖАМ...

**Начальнік мясаперапрацоўчага цэха Ларыса МІХАН:**

— Мы перапрацоўваем прыкладна 60 працэнтаў свініны, атрыманай на комплексе «Усходні», а гэта даволі сур'ёзная лічба. Наш участак перапрацоўкі выпрацоўвае шмат разнастайнай прадукцыі, якая карыстаецца ўстойлівым попытам у пакупніка. Напрыклад, варана-вэнджаныя «Салямі», паўвэнджаныя каўбасы, рулеты мясныя, сыравэнджаныя прадукты.

З не меншай ахвотай насельніцтва купляе нашы паўфабрыкаты — буйнакавалкавыя, дробнакавалкавыя, хуткага прыгатавання ў марынадах. У агульным аб'ёме вытворчасці паўфабрыкаты займаюць прыкладна 45 працэнтаў. А ўсяго ў асартыментным пераліку 140 найменняў прадукцыі.

Калі я кажу, што выпускаем прадукцыю на любы густ і пад розныя магчымасці пакупніка, то маю на ўвазе таксама паштэты, халадцы, сальтысоны, зельцы, ліверную каўбасу, якая займае цэлых 15 працэнтаў агульнага аб'ёму.

Для далейшага развіцця вытворчасці ў нас магчымасцяў пакуль няма, бо знаходзімся ўнутры комплексу «Усходні», а значыць, надзвычай абмежаваныя ў вытворчых плошчах. Каб перапрацоўваць увесь аб'ём прадукцыі, якая вырошчваецца комплексам, патрэбны новыя вытворчыя плошчы, новыя халадзільныя камеры, дадатковае абсталяванне.

Попыт на нашу прадукцыю такі, што цалкам заяўкі гандлёвай сеткі мы пакуль выканаць не можам, як бы ні стараліся. Адсюль — патрэбна вырашаць пытанне аб далейшым пашырэнні магутнасцяў.

## ШЭСЦЬ ДАЯРАК НА 500 КАРОЎ

**Намеснік генеральнага дырэктара па сельскагаспадарчай вытворчасці Іван КЛІШЭЎСКІ:**

— Вывесці СВУ на ўстойлівую самаакупнасць — такую мы паставілі перад сабой задачу. Гэта значыць, працаваць прыбыткова, эфектыўна, як увесь калектыў акцыянернага таварыства. Сур'ёзныя крокі ў гэтым накірунку зроблены.

Сэрца любога сельскагаспадарчага прадпрыемства — яго машына-трактарны парк. Калі гэтае сэрца працуе рытмічна, то і гаспадарка будзе жыць. У апошні час, каб падмацаваць сваё «сэрца», набылі шмат тэхнікі па лізінгу. Раней на «ўзбраенні» былі «Кіраўцы», «Беларусы». А ў нас толькі раллі 5 тысяч 800 гектараў. І гэтыя амаль шэсць тысяч патрэбна штогод заараць. Зараз па лізінгу набылі нашы МТЗ-3022, а гэта — магутны трактар. Патрэбна толькі падабраць на яго нармальнага механізатара і даць яму магчымасць зарабіць. Калі ён будзе атрымліваць два з паловай — тры мільёны, то за ноч вырашае ўсе праблемы з бягучым рамонтам.

Асабіста я лічу, што купляць патрэбна не проста магутны трактар ці новы камбайн, а тэхналогію з наборам тэхнікі пад яе. Толькі тады пакупка набывае сэнс. І не патрэбна будзе пад кожную адзінку тэхнікі шукаць механізатара. Мы змаглі скараціць прыкладна 20 трактарыстаў менавіта таму, што пачалі ўкараняць перадавыя тэхналогіі і пад іх уводзіць узаемазамянняльнасць механізатараў. Гэта калі сёння механізатар працуе на «Джон Дзіры», заўтра перасеў на камбайн, а паслязаўтра выконвае нейкія іншыя задачы.

Таму ў нас няма праблемы з механізатарскімі кадрамі. Ствараем для іх належныя ўмовы працы і адпачынку. Перш за ўсё прывялі ў належны выгляд майстэрню сельскагаспадарчай тэхнікі.

Няма праблемы і з жывёлаводамі, таксама ў выніку прадуманай арганізаванай іх работы. Яшчэ параўнальна нядаўна перыядычна шукалі даярак. Але пасля таго, як паставілі гомельскую даільную залу, якая аўтаматызавала працэс і выслабаніла рукі для іншых фермаў, праблема з кадрамі вырашылася сама сабой. У нас на 500 кароў засталося шэсць даярак.

Арганізавалі кармавую пляцоўку з кармавымі сталамі побач з фермай — і накармілі ўдосталь статак. За кошт таго, што адпала неабходнасць ганяць яго ў поле, скарацілі колькасць пастухоў. Два спраўныя пагрузчыкі на кармавой пляцоўцы і два талковыя трактарысты за рулём дазволілі скараціць і колькасць раздатчыкаў кармоў, карміць статак сістэмна, своечасова, без перакураў. А сёння працуюць ужо тры пагрузчыкі і тры механізатары, таму што выходзім на больш высокі ўзровень надояў, таму кармоў спатрэбілася больш.

Такім чынам, выслабанілі рукі і адначасова дысцыплінавалі тых, хто прывык дыктаваць свае ўмовы. Такія цвярозыя падыходы прымусілі задумацца і іншых, хто застаўся працаваць даглядчыкам жывёлы. Людзі трымаюцца за сваё месца, якое, да таго ж, лепш аплачваецца.

Дабіліся, што больш за 60 працэнтаў малака ідзе класам «Экстра», за які і гаспадарка, і людзі атрымліваюць зусім іншыя грошы.

Павялічваем пагалоўе. Нам патрэбна выходзіць на шэсць тысяч галоў буйной рагатай жывёлы — яшчэ і таму, што тэхналагічна апраўданы кругаварот арганікі на палях гарантуе высокую ўраджайнасць культур.

Будуем другую даільную залу, яна таксама будзе «начынена» айчынным абсталяваннем. Лічу стаўку на айчынныя агрэгаты і механізмы апраўданай. І вось чаму. Цудоўная машына «Джон Дзір», іх у нас пяць, але нядаўна на адным выйшаў са строю генератар. Колькі, вы думаеце, нам сказалі, будзе каштаваць рамонт? Дваццаць два мільёны. На іншай фірме таксама назвалі не «слабую» цану — чатырнаццаць мільёнаў. Добра, што не кінуліся плаціць, бо на адной з прыстойных станцый тэхнічнага абслугоўвання, якія рамантуюць імпартныя легкавыя аўтамабілі, нам адрамантавалі генератар за чатырыста тысяч. Так што павінен быць цвярозы падыход ва ўсім.

Паляводы гаспадаркі сабралі амаль дзевяць тысяч тон збожжа ў амбарнай вазе пры ўраджайнасці 34 цэнтнеры з гектара. Ужо выйшлі на мінулагодні паказчык па ўраджайнасці кукурузы — намалацілі паўтары тысячы тон. І ў полі стаіць яшчэ два разы па столькі, вядзецца ўборка. Рапс таксама не дрэнны. Можна нават гаварыць пра самаакупляемасць паляводчай галіны. А гэта ўжо неблагая база для вываду ўсёй гаспадаркі на больш сур'ёзныя параметры ў рабоце.

За восем месяцаў у нас 110 працэнтаў прыросту вытворчасці валавой прадукцыі да адпаведнага мінулагодняга паказчыка. Па прывагах выходзім за восем месяцаў на 634 грамы, што таксама больш мінулагодняга.

Калі параўноўваць далей, то летась рэнтабельнасць склала 2,43 працэнта, а чысты прыбытак быў 149 мільёнаў рублёў. А сёлета толькі за восем месяцаў рэнтабельнасць 13,8 працэнта (па малацэ — наогул 28 працэнтаў) і чысты прыбытак — 725 мільёнаў. Па годзе будзе яшчэ больш. Так што пры падтрымцы ўсяго вялікага калектыву акцыянернага таварыства і дзякуючы асабістай дапамозе генеральнага дырэктара Наталіі Віктараўны Манько крочым даволі ўпэўнена.

**Публікацыю падрыхтавалі Уладзімір ХІЛЬКЕВІЧ, Алена ДАЎЖАНОК і Яўген ПЯСЕЦКІ (фота).**

УНП 200166738


На службе ў земляробаў лепшыя ўзоры айчыннай і замежнай сельгастэхнікі.
Адзін з такіх волатаў — самаходны шматаперацыйны апырсквальнік раслін (яго дэманструе вядучы інжынер Віктар ЧЭРНІК).







За бесперабойную працу абсталявання па вытворчасці рапсавага алею адказвае слесар-электрык Сяргей ПАПОЎ, а за кантроль якасці прадукцыі — тэхнік вытворча-тэхналагічнай лабараторыі Алена ХАРАВЕЦ.

